**Карпекін, К.** Лёс калышанскай царквы Архістроціга Міхаіла (1917–1930 гг.) / К. Карпекін // Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2006. – 9 верас. – С. 7 ; 12 верас. – С. 3.

# ЛЁС КАЛЫШАНСКАЙ ЦАРКВЫ АРХІСТРОЦІГА МІХАІЛА (1917–1930 ГГ.)

Падзеі кастрычніка 1917 года сталі своеасаблівай мяжой у жыцці грамадства. Яны паклалі пачатак актыўнаму процістаянню паміж традыцыйным і новым побытам. Упершыню за многія стагоддзі панавання хрысціянства паўстала пытанне пра неабходнасць існавання рэлігіі, а таксама ўсіх яе зямных атрыбутаў.

Але ад старых звычак пазбаўляцца заўсёды надта цяжка. Вось і пасля рэвалюцыі многія з камуністаў працягвалі наведваць храмы, што насуперак усяму працягвалі дзейнічаць і збіраць прыхаджан. Адны з іх прыходзілі сюды каб памаліцца Богу. Іншыя ж мелі тут зусім супрацьлеглыя мэты. Адпаведна, першыя атрымлівалі вымовы ці нават выганяліся з радоў Камуністычнай партыі, іншых жа мясцовыя ўлады дзякавалі за пашырэнне атэізму (па нашаму – «бязбожжа» сярод працоўных мас).

У нечым падобна склаўся лёс і царквы, размешчанай у тагачасным мястэчку Калышкі. Служкі савецкай улады заглядвалі сюды неаднаразова. Сведкамі тых адносна недалёкіх падзей сталі разнастайныя дакументы, складзеныя падчас такіх візітаў. Цяпер пэўная частка папер захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці. На падставе іх і будзе весціся дальнейшы аповед.

1917-ы год для калышанскай праваслаўнай царквы стаў адметным не толькі ўсталяваннем асаблівых адносінаў да рэлігіі, але і ў назначэнні ў храм новага святара. Менавіта Мікалаю Іванавічу Кулюкіну давялося перанесці шмат цяжкасцей, якія выпалі на долю дадзенага прыхода.

У наступным 1918-м годзе ў царкве з’явіліся нечаканыя госці – дэлегацыя мясцовых партыйных работнікаў. Яны вывезлі адсюль метрычныя кнігі за апошнія дзесяцігоддзі і накіраваліся з імі ў Калышанскі рэвалюцыйны камітэт. Там дакументы захоўваліся пэўны час, пакуль не былі перавезены ў Лёзненскі валасны выканаўчы камітэт. Варта зазначыць, што камуністы дзейнічалі ў адпаведнасці з законамі (сваімі савецкімі законамі), бо «Дэкрэт аб грамадзянскім шлюбе, аб дзецях і аб вядзенні кніг актаў грамадзянскага стану» быў прыняты яшчэ ў снежні 1917 года. Згодна з ім рэгістрацыя шлюбаў, нараджэнняў і смерцяў пераходзіла да савецкіх устаноў. Гэта быў першы крок па змяншэнню ролі царквы ў паўсядзённым жыцці чалавека. Наступныя меры будуць больш жорсткімі і вычварнымі. Асноўнай і канчатковай мэтай у сферы духоўных спраў хутка будзе абвешчана поўнае выкараненне рэлігіі. У якасці замены людзям прапануюць так званую камуністычную мараль. Але, нягледзячы на ўсе намаганні, яна не будзе поўнасцю прывіта ў грамадстве, старая ж па ідэалогіі акажацца ледзве не цалкам знішчанай. У выніку пасля распаду савецкай дзяржавы яе насельніцтва апынецца на краі духоўнай бездані…

Але ж вернемся ў мінулае! У хуткім часе пасля ўсталявання савецкай улады мясцовая адміністрацыя пачала збіраць звесткі пра колькасць дзеючых рэлігійных устаноў. З гэтай нагоды 20 верасня 1919 года Веляшковіцкі валасны выканкам паведаміў у Віцебскае губернскае статыстычнае бюро, што на тэрыторыі воласці, падпарадкаванай яму, існуе тры праваслаўныя прыходы. Сярод іх быў названы і калышанскі. Уся гэта інфармацыя ў далейшым спатрэбілася камуністам для арганізацыі ўзмоцненага наступу на царкву. Зручнай зачэпкай для яго

ажыццяўлення стаў голад у Паволжы. Заяўляючы пра неабходнасць дапамогі пацярпелым ад неўраджаю, бальшавікі спустошылі мноства храмаў.

Дзякуючы архіўным матэрыялам, можна прасачыць, як адбывалася рабаўніцтва калышанскай царквы. Першапачаткова – 6 красавіка 1922 года сюды завітала спецыяльная камісія. Яе члены не даверaлі старым інвентарным кнігам, таму склалі спецыяльны акт, дзе старанна пералічылі ўсе каштоўнасці, якія меліся ў храме.

Наступны раз святар прымаў гасцей недзе ў канцы красавіка – пачатку мая таго ж года. У працэсе сустрэчы быў складзены «Пратакол № 7 пасяджэння падкамісіі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей Віцебскага павета». У дакуменце зноў пералічваліся ўсе рэчы, вартыя ўвагі (усяго больш за 20 прадметаў). Развітваючыся, камуністы адразу пажадалі забраць з сабой два сярэбраныя пацiры, два дыскасы, дзве звяздзіцы, дзве лыжачкі, сярэбраную даразакавальніцу, дараносіцу, карэц, вокладку ад «Евангелля», два сярэбраныя крыжы. «Шчодрыя госці», адчуўшы сябе гаспадарамі, пакінулі ў царкве «для часовага карыстання» пацір з невядомага металу, даразахавальніцу, дараносіцу, сярэбраны крыж, лыжачку, дыскас і звяздіцу. Усе астатнія каштоўнасці святар пад асабістую адказнасць быў абавязаны здаць мясцовым уладам не пазней за 15 мая. На тым пакуль што і разышліся.

10 ліпеня 1922 года ў Віцебску сабралася губернская камісія па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей, каб падвесці вынікі ўсёй працы, зробленай на месцах. Усе сабраныя рэчы былі акуратна перагледжаны і ўпакаваны ў скрыню. Адначасова камісія склала вопіс каштоўных прадметаў. У ім нарабаванае багацце з калышанскай царквы чамусьці пералічваецца дзвюма асобнымі часткамі. Спачатку запісаны восем прадметаў культу агульнай вагой 5 фунтаў 17 залатнікоў (у перакладзе ў сучасныя адзінкі вагі атрымліваецца 2.120,09 грама). Затым пазначаны яшчэ 16 прадметаў, у тым ліку 10 частак-накладак з «Евангелля». Усе яны разам важылі 5 фунтаў і 36 залатнікоў, альбо 2.201,22 грама. Значыць, усяго калышанская царква дала савецкай уладзе больш як 4,3 кілаграма срэбра.

Выцягнуўшы з мястэчковага храма каштоўны метал, павятовыя ўлады часова задаволіліся і вырашылі не замінаць яго дзейнасці. Пісьмовым сведчаннем таму стала даведка, выдадзеная 19 ліпеня 1923 года калышанскаму прыходскаму савету выканаўчым камітэтам саветаў працоўных, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Віцебскага павета. Паперка стала доказам таго, што прыходскі савет прызнаны ў складзе пяці чалавек, а ўсяго калышанская праваслаўная абшчына налічвае 50 асоб.

Больш-менш спакойнае жыццё святара было парушана ў 1925 годзе. Прыкладна ў ліпені-верасні (на жаль, немагчыма паведаміць дакладную дату) да яго завітала некалькі чалавек, а менавіта загадчык калышанскай школы, сакратар сельсавета, загадчык хаты-чытальні ды старшыня сялянскага камітэта. Гэтыя асобы мелі мэтай выявіць у царкве архіў, бібліятэку і рэчы, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Усе свае назіранні вышэйпамянёныя таварышчы запісалі ў «Апытальны ліст пра царкоўныя і манастырскія архівы». Дадзены дакумент апроч асноўнай інфармацыі ўтрымлівае ў сабе яшчэ крыху дадатковых цікавых звестак. Напрыклад тое, што храм быў пабудаваны ў 1864 годзе самімі прыхаджанамі і названы ў гонар Архістраціга Міхаіла – правадыра нябеснага воінства. Царква была драўлянай і мела адзін прастол. Наконт архіва паведамлялася наступнае. Ён знаходзіўся пад наглядамі царкоўнага савета, але фактычна ім загадаваў святар – айцец Мікалай. Архіў захоўваўся ў рызынцы ў шафе. Адначасова ў анкеце

зазначалася, што месца гэтае – небяспечнае для ўтрымання тут разнастайных папер, бо і шафа, і сама царква – драўляныя.

Сам архіў аказаўся дастаткова багатым і змястоўным. Ён складаўся з царкоўнага летапісу за 1872–1873 і 1877–1909 гады, клірных ведамстваў, метрычных кніг за 1835–1840 ды 1918–1925 гады (узгадаем, што астатнія былі забраны з царквы яшчэ ў 1918 годзе), запісаў споведзяў 1891 года і 1913–1925 гадоў, шлюбных вышукаў, што занатоўваліся з перапынкамі ў 1827–1904 гадах, прычым да 1833 года запісы тут вяліся на польскай мове, пяці прыхода-расходных кніг, якія ахоплівалі 1943–1904 і 1917–1919 гады. Таксама ў калышанскай царкве быў выяўлены тэкст літургіі, датаваны 1846-м годам. Левая старонка была напісана на «славянскай» мове (верагодна, на старaславянскай), а правая з тым жа самым тэкстам – на яўрэйскай. У рэшце рэшт, агульная змястоўнасць і якасць архіва была вызначана камуністамі ў такіх адзінках вагі, як пуды і фунты. Згадзіцеся, больш мэтазгодна вызначаць агульную колькасць кніг і іх храналагічны ахоп. Хаця, яшчэ невядома, для якіх мэт прыхільнікі Саветаў збіраліся выкарыстоўваць царкоўны архіў. Дык вось, усе матэрыялы важылі 6 пудоў 20 фунтаў (ці 106,47 кілаграма). Што датычыцца бібліятэкі калышанскага храма, то яна змяшчала ў сабе кнігі, неабходныя для набажэнстваў. Кнігі рэлігійнага зместу і газеты «Епархіяльныя ведамасці».

У той жа дзень ахвочыя да чужога багацця камуністы старанна агледзелі ўнутранае ўбранне царквы. Ім удалося выявіць «распяцце драўлянае на ахвярніку польскага ўплыву на рэлігію» і «абраз Мікалая Цудатворцы каталіцкага пісьма часоў Уніі», на якім была выканана разьба па дрэве ў форме галінак. Абедзьве рэчы былі прызнаны атэістамі, як «адметныя па старажытнасці і арыгінальнасці».

Атрымліваецца, што хрысціянскі храм існаваў у Калышках яшчэ ў першай трэці XIX стагоддзя (самыя раннія матэрыялы царкоўнага архіва датаваны 1827-м годам). Магчыма, гэта быў каталіцкі касцёл ці, яшчэ верагодней, уніяцкая царква. Тады з 1839 года яна павінна была быць далучана да рускай праваслаўнай царквы. Можна меркаваць, што ў пачатку 1860-х гадоў будынак старога храма аказаўся ў дрэнным стане, і ўзнікла патрэба ва ўзвядзенні новай царквы, якое было завершана да 1864 года. Тады ж царква Архістраціга Міхаіла атрымала ў спадчыну не толькі ўсю маёмасць старога храма, але і абавязак несці людзям слова Боскае.

Так працягвалася ўсю другую палову XIX стагоддзя і амаль дваццаць гадоў XX стагоддзя. Тое, што калышанская царква дзейнічала ў 1928 годзе, можна сцвярджаць з упэўненасцю. Бо ў «Спісе цэркваў і малітоўных дамоў усіх рэлігій па Віцебскай акрузе», складзеным у тым годзе, пад № 226 запісана калышанская праваслаўная абшчына ў мястэчку Калышкі Лёзненскага раёна. У гэты ж час быў складзены «Спіс служачых рэлігійных культаў, зарэгістраваных Віцадмаддзелам па Лёзненскаму і Высачанскаму раёнах на 1 кастрычніка 1928 года». Тут трэцім пазначаны Кулюкін Мікалай Іванавіч – святар з м. Калышкі. Але наглядаць за сваім прыходам яму заставалася лічаныя месяцы. Дзесьці ў прамежку часу з канца 1928 года да пачатку 1930-га местачковая царква была зачынена.

Але 31 сакавіка 1930 года адбылася спроба вернікаў вярнуць сабе храм, выгнаць адтуль чужынцаў. Дзеля гэтага перад будынкам сельскага Савета сабралася каля 200–250 чалавек. Згодна з умовамі старшыні сельсавета, местачкоўцы, доўга не думаючы, сабралі подпісы і арганізавалі абшчыну. Нягледзячы на свае абавязкі і праведзеную работу, прадстаўнік мясцовай улады не спяшаўся аддаваць храм ў распараджэнне веруючых. Дарэчы, у архіўных дакументах за

1930-я гады не трапляецца звестак пра дзейнасць праваслаўнай царквы ў мястэчку Калышкі. З гэтага можна зрабіць выснову, што храм так і застаўся зачыненым. Але ён працягваў стаяць у Калышках яшчэ даволі доўга, бо на тапаграфічнай карце, складзенай у чэрвені 1941 года для генеральнага штаба Чырвонай Арміі, пазначана месцазнаходжанне гэтага культавага будынка. Ён стаў своеасаблівым сімвалам слабасці чалавечай веры, заганнай нерашучасці і маўкліва сведчыў пра тое, што пасіўнае чаканне ніколі не прывядзе да пастаўленай мэты. Мара стане часткай жыцця толькі праз дзеянне, настойлівасць і мэтанакіраванасць.

**К. КАРПЕКІН,**
**студэнт гістарычнага факультэта**
**ВДУ імя П. М. Машэрава**